развитие и национальную политику. Это исследование дает нам лучшее и более глубокое понимание истории и динамики развития социальных сетей в Китае и влияния социальных сетей на развитие страны, а также представление о тенденциях и вызовах, с которыми столкнутся китайские социальные медиа.

В современном мире социальные сети по-прежнему являются важным фактором. Историческое развитие социальных сетей в Китае является примером взаимодействия и влияния технологий и политической культуры в этот сложный информационный век.

1. Бу, В. – Методологические вопросы эмпирических исследований в области коммуникации / В. Бу // Журналистика и коммуникационные исследования. – 1994. – № 2. – С. 8.

2. Вэй, Ш, Исследование функции «тем» китайских социальных сетей с точки зрения теории диалога: дис. ... канд. социа. наук: 23.10.15 / Ш. Вэй. – Шанхай, 2017. – 127 с.

3.Цао, Б. Социальные медиа: концепция, история развития, характеристики и будущее – Разговор о неоднозначности нынешнего понимания социальных медиа / Б. Цао // Журнал Хунаньского университета радио и телевидения. – 2011. – № 3. – С. 65–69.

## РОЛЯ МУЗЕЙНАГА ПРАДМЕТА Ў ФАРМІРАВАННІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ НА ПРЫКЛАДЗЕ КАЛЕКЦЫІ ГАДЗІННІКАЎ АШМЯНСКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ ІМЯ Ф.К. БАГУШЭВІЧА

***Петражыцкая В.М.,***
*суіскальнік БДУКМ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Паўлава А.Я.,*** *канд. гіст. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Музей, гадзіннік, прадмет, калекцыя, культура, побыт, гістарычная памяць.

Key words. Museum, clock, object, collection, culture, everyday life, historical memory.

Адной з найважнейшых задач сучаснага музея з’яўляецца выхаванне патрыятызму і любові да Радзімы. Гэтага можна дасягнуць у тым ліку з дапамогай культурнай або гістарычнай памяці, якой валодае наша грамадства. Музейныя прадметы павінны абуджаць гістарычную памяць там, дзе пра яе забылі, перадаваць яе іншым людзям і пакаленням. Мэтай даследавання з’яўляецца вызначэнне ролі музейных гадзіннікаў у фарміраванні гістарычнай памяці ў межах аднаго музея – Ашмянскага краязнаўчага музея імя Ф. Багушэвіча.

**Матэрыял і метады**. Паколькі артыкул прысвечаны аналізу гадзіннікаў у калекцыі Ашмянскага краязнаўчага музея імя Ф. Багушэвіча, то, безумоўна, асноўным матэрыялам з’яўляюцца прадметы, якія ў цяперашні час захоўваюцца ў фондах музеяў. Пры напісанні артыкула ў першую чаргу выкарыстоўваўся архіў уліковай дакументацыі УК “Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф.К.Багушэвіча”. У аснову даследавання пакладзены культуралагічны падыход, які разглядае гадзіннік як адметны артэфакт культуры. Метадалагічнай асновай даследавання з’яўляецца сукупнасць агульнанавуковых метадаў даследавання і навуковых метадаў гістарычнай навукі. У якасці спецыяльных музеязнаўчых навуковых метадаў ужыты метад апісання канкрэтных музейных прадметаў – гадзіннікаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф. Багушэвіча быў заснаваны пастановай Савета Міністраў БССР ад 27 верасня 1952 г., а адкрыты для наведвальнікаў 16 кастрычніка 1955 г. [2, с. 59]. Першапачаткова плошча экспазіцыі складала 144 кв. м. Затым некалькі разоў змяняліся музейныя будынкі і экспазіцыі, пакуль у 2009 г. музей не пераехаў у гістарычны будынак на цэнтральнай плошчы горада. У 2013 г. у новым будынку музея адкрылася пастаянная экспазіцыя.

Музейны фонд Ашмянскага краязнаўчага музея імя Ф. Багушэвіча складае каля 25 000 адзінак захоўвання, у тым ліку – звыш 13 000 прадметаў асноўнага фонду [1]. Прадметам камплектавання музея з’яўляецца побыт, культура, прырода і гісторыя Ашмянскага краю. Частка музейнай калекцыі прысвечана жыццю і творчасці беларускага паэта Францішка Багушэвіча. Музейныя прадметы падзелены на 15 калекцый: «Жывапіс»,

«Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Археалогія», «Нумізматыка», «Баністыка», «Дакументы», «Друкаваныя выданні», «Фалерыстыка», «Вексілалогія», «Зброя і вайсковы рыштунак», «Адзенне», «Побыт», «Фотадакументы», «Жывёлы», «Графіка». Маецца краязнаўчая картатэка [4].

Калекцыя гадзіннікаў пачала фарміравацца ў 1957 г. Першым гадзіннікам, які быў прыняты ў фонд музея, стаў настольны гадзіннік сістэмы "SF". Гэта мемарыяльны гадзіннік сям'і Ф. Багушэвіча і размяшчаецца ён у экспазіцыйнай зале "Старонкі гісторыі края ў XX ст.". Гадзіннікі ўваходзяць ў калекцыю «Побыт». Сёння ў фондах Ашмянскага краязнаўчага музея імя Ф. Багушэвіча захоўваецца 75 гадзіннікаў, з іх наручныя гадзіннікі (25 адзінак), будзільнікі (14), кішэнныя (6), настольныя (14), насценныя (15), падлогавы (1). Пераважная большасць гадзіннікаў (60 адзінак) прыняты ў фонд музея за апошнія 20 гадоў. Усе прадметы музейнага значэння атрыманы ў якасці ахвяраванняў.

Працэс трансляцыі культурнай памяці і фарміравання гістарычнай свядомасці ў музеі звязаны ў першую чаргу з прадметамі, якія захоўваюцца ў дадзеным музеі. Інтэрпрэтацыя культурнай памяці музейнымі сродкамі – гэта не проста апісанне экспануемых аб'ектаў, а стварэнне кантэксту размяшчэння музейнага прадмета ў агульнай прасторы музейнай экспазіцыі і адносна іншых прадметаў [3, с. 83–84].

З лістапада 2013 г. у музеі працуе экспазіцыя, якая ўключае 4 залы, прысвечаныя прыродзе, гісторыі і культуры Ашмянскага краю. Гадзіннікі прадстаўлены ў 3 экспазіцыях: «Ашмяны ад старажытнасці да сучаснасці», «Славутыя мясціны Ашмяншчыны» і «Старонкі гісторыі края ў XX стагоддзі».

Экспазіцыйная зала «Ашмяны ад старажытнасці да сучаснасці» прысвечана гісторыі мястэчка Ашмяны. У ёй разам з макетам цэнтральнай плошчы горада, археалагічнымі знаходкамі, манетамі, картамі, зброяй размешчаны 4 гадзінніка. Першы з іх – кішэнны швейцарскі гадзіннік «Brenets» канца XIX ст. (УК "Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф. Багушэвіча" КП 000719). Другі – кішэнны гадзіннік з мельхіёравым корпусам канца XIX – пачатку XX ст. фірмы з Санкт-Пецярбурга «H.Moser@Cie» (КП 004684/3). Трэці і чацвёрты – таксама кішэнныя гадзіннікі пачатку XX ст. нявысветленнага паходжання (КП 004684/1 і КП 004684/2). Гадзіннікі знаходзяцца ў вітрыне разам з фотаздымкамі і дакументамі жыхароў Ашмян першай трэці XX ст., тым самым дапамагаюць наведвальнікам адчуць тую эпоху. Яны прыцягваюць увагу сваёй эстэтычнасцю і дасканаласцю.

Экспазіцыйная зала «Славутыя мясціны Ашмяншчыны» прысвечана славутым архітэктурным помнікам былых мястэчкаў сучаснага Ашмянскага раёна: касцёлам у Мураванай Ашмянцы, Барунах, Жупранах, замка ў Гальшанах, а таксама выбітным людзям Ашмянскай зямлі. Каб паказаць сучаснаму чалавеку шляхецкую культуру сядзібаў XIX – пачатку XX ст., у зале выстаўлены мэбля, люстэрка, посуд, вопратка, якія маглі належыць заможным колам тагачаснага грамадства. Аднак увага адразу прыцягваецца да месца, дзе знаходзіцца падлогавы гадзіннік з боем, які размешчаны ў драўляным футарале вышынёй амаль 2 метры. Гэты гадзіннік быў зроблены ў пачатку XX ст. нямецкай фірмай "DUFA" з механізмам бою фірмы "Maffin Gong" і з'яўляецца адным з найкаштоўнейшых прадметаў музея, паколькі належаў ашмянскаму купцу Лейбу Стругачу (КП 000907). На сцяне адразу за футаралам напольнага гадзінніка падвешаны 2 знешне падобных насценных гадзінніка XIX ст. у драўляных футаралах (КП 002090 і КП 001939). Побач на сакратэры знаходзяцца настольны гадзіннік пачатку XX ст. у драўляным футарале (КП 001963). Разам гэтыя 4 гадзінніка складаюць сапраўдную музейную кампазіцыю, якая не толькі стварае моцнае ўражанне, але і не дае памыліцца ў вызначэнні гістарычнасці музейнага прадмета нават недасведчаным у гісторыі людзям.

Экспазіцыйная зала «Старонкі гісторыі краю ў XX стагоддзі» дэманструе наведвальнікам эпоху СССР. Прадметы побыту, плакаты, кнігі, радыёпрымач і іншыя рэчы павінны вярнуць у час маладосці тых, хто нарадзіўся ў СССР, і пагрузіць у тую эпоху тых наведвальнікаў музея, хто яе не застаў. Сярод іх і 4 гадзінніка (2 настольных і 2 насценных), выробленыя ў СССР у 1950–1980-ыя гг. Першы настольны механічны гадзіннік "ОЧЗ" быў выраблены на Арлоўскім гадзіннікавым заводзе ў 1950-ыя гг., мае круглы металічны корпус блакітнага колеру, чорныя арабскія лічбы на белым цыферблаце (КП 004965). Другі

настольны гадзіннік “Хозяйка медной горы” быў выраблены на Чалябінскім гадзіннікавым заводзе “Молния” у 1970–1980-ыя гг. Корпус гадзінніка адліты з чугалю – сплава чугуна і алюмінія і стварае мастацкі вобраз легенды ўральскіх гарнякоў (КП 004051). Трэці гадзіннік – насценны “Мішкі ў лесе” з механізмам ходзікаў быў выраблены ў 1940–1950-ыя гг. на Сярдобскім гадзіннікавым заводзе (НД 001198). Чацвёрты гадзіннік – таксама насценны – быў выпушчаны на Арлоўскім гадзіннікавым заводзе “Янтарь” у 1990 г. (ЧЗ 000428).

У гэтай жа зале знаходзіцца мемарыяльны куток беларускага паэта Францішка Багушэвіча, у якім з дапамогай старой мэблі, люстэрка і партрэта паэта створаны вобраз ягонага дома. Важнейшае месца тут займае настольны гадзіннік XIX ст. з металічным корпусам сістэмы «SF», які быў ва ўласнасці сям’і Ф. Багушэвіча (КП 000191). Гадзіннік мае не толькі эстэтычную, але і мемарыяльную каштоўнасць.

**Заключэнне.** Сапраўдны музейны прадмет – гэта сведка розных эпох, з дапамогай якога ствараецца нагляднае і дакладнае гістарычнае асяроддзе. Гадзіннікі ў музейнай экспазіцыі забяспечваюць не толькі інфарматыўнасць, яны фарміруюць гістарычную памяць праз моцнае эмацыйнае ўздзеянне. З калекцыі гадзіннікаў Ашмянскага краязнаўчага музея імя Ф.К.Багушэвіча ў асноўную экспазіцыю трапілі 13 з 75 гадзіннікаў. Гадзіннікі побач з іншымі музейнымі прадметамі надаюць гістарычнай экспазіцыі экспрэсіўнасць і атрактыўнасць. Іх знешняя форма, матэрыял, з якога выраблены корпус, дазваляюць наведвальнікам даволі дакладна меркаваць пра час іх стварэння. Прыналежнасць да вядомай асобы шматразова павышае каштоўнасць гадзіннікаў у вачах наведвальніка. Такім чынам гадзіннікі як музейныя прадметы выконваюць важную ролю ў справе фарміравання гістарычнай памяці нашага грамадства.

1. Архіў уліковай дакументацыі УК “Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф.К.Багушэвіча”.
2. Іванова, Ж. І. Ашмянскі краязнаўчы музей / Ж. І. Іванова // Музеі Беларусі. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2008. – С. 59.
3. Овчинникова, З. А. Роль музеев в формировании, поддержке и трансляции исторической и культурной памяти / З. А. Овчинникова // Вестник культуры и искусств. – 2018. – № 1 (53). – С. 82–89.
4. УК “Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф. Багушэвіча” [Электронны рэсурс] // – Рэжым доступу: http://oshmuzey.by/ – Дата доступу: 18.09.2023

## НАУЧНО-ТЕХНИЧЕСКОЕ СОТРУДНИЧЕСТВО МЕЖДУ КИТАЙСКИМИ И БЕЛОРУССКИМИ УНИВЕРСИТЕТАМИ В 2013–2016 гг.

***Сунь Шэнцзы,***
*аспирант БГУ, г. Минск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – **Ковяко И.И.,** канд. ист. наук, доцент*

Ключевые слова. Китайская Народная Республика; Республика Беларусь; китайско-белорусские отношения; научно-технологическая сфера; университетское сотрудничество.

Key words. People's Republic of China; Republic of Belarus; Chinese-Belarusian relations; technology field; university cooperation.

Научно-технологическое сотрудничество между университетами Китая и Беларуси имеет большие перспективы развития и давнюю историю. В 2013 г. отношения двух государств вышли на новый уровень – всестороннее стратегическое партнерство. Это придало новый импульс кооперации во всех областях. В 2015 г. в целях расширения китайско-белорусского сотрудничества в области науки, технологий и инноваций на региональном уровне Национальная академия наук Беларуси, Фонд фундаментальных исследований Республики Беларусь и Китайская академия общественных наук подписали соглашение о научном сотрудничестве [1]. Сотрудничество между университетами двух стран стало более активным, особенно со стороны БГУ, БНТУ, БГУИР и ГГУ, которые наладили устойчивое сотрудничество с китайскими университетами науки и технологий, такими как Далянский технологический университет, Харбинский университет науки и технологий и др. Верхняя граница исследования обусловлена выходом китайско-белорусских отношений на